**Тэкст дыктанта**

**для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**ў ДУА "Мінскае абласное кадэтскае вучылішча"**

**8 клас**

## Перад навальніцай

Дзень выдаўся спякотны. Раптам недзе глуха загрымела, як з-пад зямлі. Неўзабаве хмара паказалася і з другога боку, што сінеў над далёкім лесам. Хмара ўсё расла і расла.

Спачатку іх было дзве. Верхняя спакойна, але хутка плыла, падымалася ўсё вышэй. Ніжняя як бы ўзыходзіла з самага лесу. На нейкі момант нібы зачапілася за яго і не змагла адарвацца. 3 краёў яна віхрылася дзівоснымі сінімі клубкамі, ірвалася ўперад і гнеўна кідала ў лес яркія бліскавіцы. Яна паласавала неба ў розных напрамках. Адна такая бліскавіца пракацілася вогненным колам каля самай зямлі. І раптам хмара імкліва рванулася ўперад і неўзабаве дагнала сваю верхнюю сяброўку, закрыла яе.

Да зямлі пацягнуліся доўгія, касыя ніткі дажджу. (111 слоў)

*Паводле І. Шамякіна.*